ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2025 № 446

# Білеты
## для правядзення выпускнога экзамену і экзамену ў парадку экстэрнату пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі»

2025/2026 навучальны год

Білет № 1

1. Асаблівасці найстаражытных цывілізацый: узнікненне першых лакальных цывілізацый у свеце. Рабства ў старажытных цывілізацыях. Асаблівасці арганізацыі ўлады, грамадства і эканомікі Старажытнага Усходу. Гарады-дзяржавы і старажытныя імперыі.

2. Беларусь у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях 1917 г. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі ў Расіі. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі. Уплыў рэвалюцыі на ўздым беларускага нацыянальнага руху. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі.

Білет № 2

1. Вялікая славянская міграцыя і Беларусь: праблема паходжання славян. Шляхі міграцыі славян ва Усходняй Еўропе. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі.

2. Краіны Захаду ў міжваенны перыяд: асноўныя этапы эканамічнага развіцця. Сацыяльныя і палітычныя перамены. Сусветны эканамічны крызіс і яго наступствы.

Білет № 3

1. Дзяржавы Ранняга і Высокага Сярэднявечча ў Еўропе: Вялікае перасяленне народаў. Новая палітычная карта Еўропы. Візантыйская імперыя і яе ўплыў на славянскія народы. Асаблівасці еўрапейскіх дзяржаў Ранняга і Высокага сярэднявечча.

2. Развіццё культуры Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд. Палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры. Адукацыя ў Савецкай Беларусі. Станаўленне беларускай навукі.

Білет № 4

1. Старажытная Русь – дзяржава ўсходніх славян: утварэнне Старажытнарускай дзяржавы. Беларускія землі ў Старажытнарускай дзяржаве. Княжацкая ўлада. Палітычная раздробленасць Старажытнай Русі, яе прычыны і наступствы.

2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі. Гістарычныя ўмовы ўтварэння беларускай дзяржавы. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. Рыжскі мірны дагавор. Удзел ССРБ ва ўтварэнні СССР. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Білет № 5

1. Першыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі: утварэнне Полацкага княства. Дзейнасць полацкіх князёў па ўмацаванні дзяржавы. Тураўскае княства. Асаблівасці становішча Гарадзенскага княства.

2. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд. Тэрытарыяльны передзел свету пасля Першай сусветнай вайны. Нацыянальна-вызваленчыя рухі і іх ідэалогіі. Асаблівасці развіцця краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Білет № 6

1. Грамадства і эканоміка беларускіх зямель у IX–XIII стст.: структура грамадства. Роля абшчыны. Асаблівасці развіцця гаспадаркі. Развіццё рамёстваў. Шляхі ўзнікнення і функцыі старажытных гарадоў Беларусі. Характар і змест гандлю.

2. Савецкае дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917–1939 гг. Грамадзянская вайна: асноўныя этапы, удзельнікі і іх мэты, наступствы. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады. Савецкая мадэрнізацыя. Утварэнне СССР.

Білет № 7

1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага: прычыны ўтварэння новай дзяржавы. Шляхі ўваходжання ўсходнеславянскіх земляў у новую дзяржаву. Дзейнасць вялікіх князёў па фарміраванні тэрыторыі дзяржавы.

2. Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. Тэрыторыя, насельніцтва. Аграрна-сыравінны характар эканомікі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх улад. Паланізацыя. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і працоўны рух.

Білет № 8

1. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый у Познім сярэднявякоўі: стварэнне цэнтралізаваных дзяржаў у Заходняй Еўропе. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў. Візантыя ў перыяд Позняга сярэднявечча.

2. Вялікая Айчынная вайна: планы нацысцкай Германіі адносна СССР. Характар вайны. Асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Білет № 9

1. Развіццё феадальных адносін у ВКЛ: пазямельныя адносіны ў ВКЛ. Саслоўі феадальнага грамадства: правы, абавязкі і прывілеі. Шляхі фарміравання залежнага сялянства. Пачатак прыгону сялян на тэрыторыі Беларусі.

2. Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. Агрэсіўная палітыка Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я гады. Палітыка прымірэння агрэсара. Мюнхенскі дагавор і яго роля ў развязванні вайны. Дзейнасць СССР у кантэксце геапалітычнай сітуацыі ў свеце.

Білет № 10

1. Культура Беларусі ў другой палове XIII–XV ст.: характар культурных працэсаў у ВКЛ. Культавае і абарончае дойлідства. Літаратура. Забавы і святы.

2. Другая сусветная вайна: асноўныя ўдзельнікі і іх геапалітычныя мэты. Перыядызацыя Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Асноўныя тэатры ваенных дзеянняў. Рух супраціўлення. Дзейнасць антыгітлераўскай кааліцыі: дасягненні і праблемы. Наступствы Другой сусветнай вайны.

Білет № 11

1. Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў: Вялікія геаграфічныя адкрыцці і пачатак еўрапейскага каланіялізму. Стварэнне Іспанскай і Партугальскай каланіяльных імперый. Каланіяльная экспансія Англіі і Францыі. Асноўныя наступствы еўрапейскага каланіялізму.

2. Вялікая Айчынная вайна. Палітыка германскіх улад на акупаваных тэрыторыях. Партызанскі і падпольны рух. Вытокі духоўнай стойкасці савецкага народа. Цана Перамогі. Роля Савецкага Саюза ў Вялікай Перамозе.

Білет № 12

1. Палітычнае развіццё Беларусі ў XVI–XVIII стст.: статуты ВКЛ 1529, 1566 гг. Люблінская унія. Адукацыя Рэчы Паспалітай. Барацьба ВКЛ за самастойнасць. Статут ВКЛ 1588 г. Прычыны ўнутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. Спробы рэформ. Раздзелы Рэчы Паспалітай.

2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і іх значэнне. Насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Генацыд беларускага народа.

Білет № 13

1. Гуманізм і Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі: асаблівасці эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, асветнік, філосаф і гуманіст. Паслядоўнікі Францыска Скарыны. Дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.

2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. Эканамічная эксплуатацыя акупаваных тэрыторый. Калабарацыянізм: прычыны і формы. Масавая

барацьба супраць нацысцкіх захопнікаў. Партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі Беларусі.

Білет № 14

1. Эпоха Асветніцтва: сутнасць і асноўныя ідэі Асветніцтва. Асаблівасці Асветніцтва ў асобных еўрапейскіх краінах. Асаблівасці палітыкі асветніцкага абсалютызму. Эпоха Асветніцтва ў Расіі.

2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя «Баграціён». Уклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй. Наступствы вайны для Беларусі.

Білет № 15

1. Рэфармацыйны рух і Контррэфармацыя ў ВКЛ: канфесійная сітуацыя ў пачатку XVI ст., асаблівасці і напрамкі Рэфармацыі. Контррэфармацыя.

2. СССР у пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.) Палітычная сістэма. Узаемаадносіны ўлады і грамадства: асноўныя этапы развіцця. Дасягненні і праблемы савецкай сацыяльнай палітыкі і эканомікі. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры.

Білет № 16

1. Беларусь у еўрапейскіх войнах ранняга Новага часу: Лівонская вайна. Ваенныя канфлікты Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай у XVII ст. Казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі. Паўночная вайна і яе наступствы для Беларусі.

2. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства. Навукова-тэхнічны прагрэс. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя: сутнасць і напрамкі.

Білет № 17

1. XIX стагоддзе ў гісторыі свету і Беларусі. Мадэрнізацыя і фарміраванне індустрыяльнага грамадства. Рэвалюцыі і рэформы. Стагоддзе нацыяналізму і станаўленні новых дзяржаў. Наступствы напалеонаўскіх войн. Беларусь і Расія.

2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг. Подзвіг беларускага народа па аднаўленні эканомікі. Асноўныя этапы развіцця і структура эканомікі БССР. Сацыяльнае развіццё.

Білет № 18

1. Прамысловая рэвалюцыя: сутнасць і асноўныя этапы. Роля навукі ў развіцці прамысловасці. Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі.

2. Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту. Грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс. Прынящце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнцкія выбары 1994 г.

Білет № 19

1. Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.: асаблівасці правядзення аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Беларусі, вынікі і наступствы.

2. Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Сучасная палітычная сістэма краін Захаду. Эканамічная сістэма краін Захаду на сучасным этапе.

Білет № 20

1. Грамадска-палітычныя рухі ў Беларусі ў XIX ст. Праекты грамадска-палітычнага і культурнага развіцця Беларусі. Нацыянальныя рухі: прычыны, мэты, характар, плыні.

2. Прэзідэнцкая рэспубліка – гістарычны выбар беларускага народа. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: месца і роля ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Паўнамоцтвы, функцыі і дзейнасць.

Білет № 21

1. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі ў свеце. Фарміраванне новых ідэалогій. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі 1820-х гг. Рэвалюцыі 1830–1831 гг. Рэвалюцыі 1848–1849 гг. Узнікненне новых нацыянальных дзяржаў у Еўропе і Лацінскай Амерыцы.

2. Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі. Рэспубліка Беларусь – сацыяльна арыентаваная дзяржава. Палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі і аховы здароўя. Дзяржаўная падтрымка інстытута сям'і. Рынак працы. Асновы маладзёжнай палітыкі.

Білет № 22

1. Беларусь на шляху да індустрыяльнага грамадства. Асаблівасці пераходу ад ручной вытворчасці да машыннай у прамысловасці. Манапалістычны капіталізм у Беларусі. Развіццё транспарту і гандлю. Фарміраванне нацыянальнага рынку. Урбанізацыя.

2. Сучаснае беларускае грамадства. Міжнацыянальныя адносіны. Канфесійная палітыка дзяржавы. Каштоўнасныя арыентацыі. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў сучаснай Беларусі.

Білет № 23

1. Першая сусветная вайна як рубежны перыяд сусветнай гісторыі: прычыны, характар вайны. Асноўныя ўдзельнікі і іх мэты. Найважнейшыя падзеі вайны. Геапалітычныя наступствы Першай сусветнай вайны.

2. Рэспубліка Беларусь у свеце. Геапалітычнае становішча. Шматвектарны характар знешняй палітыкі. Удзел у інтэграцыйных працэсах. Дзейнасць у міжнародных арганізацыях.

Білет № 24

1. Ад беларускай народнасці да беларускай нацыі: паняцце «нацыя», умовы фарміравання беларускай нацыі. Развіццё навуковых ведаў аб Беларусі і беларускім народзе.

2. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР. Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы. Узаемадзеянне ў сферы знешняй палітыкі і бяспекі.

Білет № 25

1. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны: становішча насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Брэсцкі мірны дагавор. Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі.

2. Культура сучаснай Беларусі. Прыярытэтныя напрамкі развіцця навукі. Інавацыйнае і навукова-тэхналагічнае развіццё. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Спартыўныя дасягненні.